# ПІСЬМЕНСТВА ЯК СІМВАЛ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**У Полацку прайшоў фінал конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», які сёлета ўпершыню набыў статус рэспубліканскага. Сваім яскравым прачытаннем нашай літаратурнай спадчыны школьнікі з усёй краіны радавалі высокіх гасцей. І ўсім было відавочна: калі беларускае слова гучыць з вуснаў маладога пакалення, значыць, яно сапраўды жывое.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У журы конкурсу ўвайшлі міністр інфармацыі Лілія Ананіч, міністр адукацыі Ігар Карпенка, міністр культуры Барыс Святлоў, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі і іншыя. Усе яны сышліся ў меркаванні, што кожны ўдзельнік фіналу прадэманстраваў надзвычай высокі ўзровень чытання твораў. **Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** адзначыла:

— Калі мы прымалі рашэнне, што менавіта ў Полацку пройдзе фінал рэспубліканскага конкурсу «Жывая класіка», мы былі ўпэўнены, што ўсе беларускія дзеці вельмі любяць і шануюць выдатнае слова пісьменніка. І, безумоўна, класічная літаратура, якая выкладаецца ў школе, — гэта не толькі веды, але і падмурак асобы дзіцяці. Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў усіх удзельнікаў з Днём беларускага пісьменства і ў сваім прывітальным слове адзначыў, што гэта свята стала неад'емнай часткай, сімвалам незалежнасці нашай дзяржавы. Гэта высокія словы — для нашых дарагіх дзяцей. Мы робім усё, каб маладое пакаленне ўзбагачалася крыніцай і мудрасцю, вытокамі нацыянальнай літаратуры і той духоўнасці, якая ёсць у кожнага з нас. Але самае галоўнае, што менавіта ў Полацку мы пабачылі нашы найлепшыя творчыя дзіцячыя сілы. А ўсё 13 тысяч дзетак, якія прынялі ўдзел у конкурсе, — гэта таксама пераможцы.

Нечаканым і прыемным сюрпрызам для фіналістаў рэспубліканскага конкурсу сталі бясплатныя пуцёўкі ў Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» на змену таленавітай моладзі ў 2018 годзе і сертыфікаты на наведванне музеяў на працягу навучальнага года.

**Міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ** адзначыў, што ўсе члены журы адзінагалосна сышліся на тым, што кожны ўдзельнік гэтага конкурсу — надзвычай таленавіты. Было бачна, што юныя чытальнікі варты самых высокіх узнагарод, бо ўклалі часцінку сваёй душы ў творы нашых класікаў і сучаснікаў.

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА,** між іншым, расказаў пра свае карані ў старажытным горадзе:

— Прыемна вяртацца ў свой родны Полацк, дзе прайшло дзяцінства, школьныя гады. Прыемна з гэтай сцэны прывітаць старажытны і малады горад. Прыемна віншаваць і ўсіх удзельнікаў конкурсу — тое, што вы стаіце на гэтай сцэне — ужо перамога. Няхай у вашай творчасці атрымаецца ўсё так, як вы задумалі.

Будзем спадзявацца, што і сапраўды далейшы шлях у юных талентаў складзецца надзвычай шчасліва. А інакш і быць не можа, калі грунтуецца ён на моцных падмурках нацыянальнай спадчыны.

***Падчас Дня беларускага пісьменства былі ўзнагароджаны і лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Падрабязней аб гэтым — у наступным нумары.***

# На скрыжаванні духоўнасці і культуры

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Архітэктарам, які адмыслова ўпісаў помнік у прастору і спраектаваў яго размяшчэнне на пастаменце, стаў Армен Сардараў. І **скульптар Уладзімір ПІПІН** пагадзіўся, што месца для ўсталявання помніка выбрана самае лепшае:

— Хачу выказаць падзяку ўсім, хто прычыніўся да гэтай, можна сказаць, святой справы, вынікам якой стала ўсталяванне памятнага знака. Для мяне, як для мастака, няма ніякіх сумневаў, што гэта найлепшае месца, самае прыгожае, якое больш за ўсе астатнія праспякнута гістарычнасцю, драматычнасцю і знакавасцю падзей, якія тут адбываліся.

## «Бацька гарадоў беларускіх»

Адной з адметнасцяў свята ў Полацку стала шэсце, якім зранку ў суботу распачалася чарада ўрачыстых мерапрыемстваў. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі бадай усіх сфер жыцця горада. На пачатку калоны сталі ганаровыя грамадзяне горада — з бела-блакітнымі стужкамі. Ну а следам за імі — супрацоўнікі розных прадпрыемстваў, медыкі, паштавальнікі, студэнты і многія іншыя. А тыя, хто не ўвайшоў у святочную калону, з радасцю сачылі за сваімі сваякамі, сябрамі, калегамі з гарадскіх бульвараў, рабілі памятныя фотаздымкі і, натуральна, гучна апладзіравалі.

Святочным канцэртам быў урачыста адкрыты Дзень горада Полацка. На ім прысутнічаў і **старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай ШАРСТНЁЎ,** які адзначыў:

— Менавіта з Полацка — бацькі гарадоў беларускіх, у 1994 годзе мы пачыналі святкаваць Дні беларускага пісьменства, аддаючы павагу роднаму слову і багатай нацыянальнай культуры. Сёлета Дзень беларускага пісьменства праходзіць на Віцебшчыне шосты раз і, што сімвалічна, трэці раз на старажытнай полацкай зямлі. Гэта ўрачыстасць выключна адметная, бо дае падставу для ўмацавання нашай дзяржаўнасці, якая тут нарадзілася, і нашай спадчыны. Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці. Менавіта ён стаў месцам фарміравання самага ранняга дзяржаўнага ўтварэння на тэрыторыі Беларусі. Гэта зямля дала свету нямала велічных і знакамітых асоб.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Адметна, што ў гэты памятны дзень быў папоўнены шэраг ганаровых грамадзян Полацка. Такое званне, «за плённую працу ў галіне фізічнай культуры і спорту, значны асабісты ўклад у развіццё параалімпійскага фехтавання ў Беларусі, высокія спартыўныя дасягненні на сусветнай арэне, якія садзейнічаюць павышэнню статусу і ўмацаванню аўтарытэту горада Полацка за мяжой» было прысвоена Андрэю Праневічу, а таксама Сямёну Сушчыну.




## «Небам званая» серыя

На выставачных пляцоўках фестывалю кнігі і прэсы, традыцыйна, сваё ганаровае месца заняў і Выдавецкі дом «Звязда». Тут была прадстаўлена прадукцыя нашага выдавецкага дома, адбываліся прэзентацыі і нязмушаныя гутаркі з чытачамі. Адмыслова да Дня пісьменства ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшла багата ілюстраваная кніга «Полацк» — своеасаблівая энцыклапедыя гісторыі і сучаснага жыцця старажытнага горада і, несумненна, — добры падарунак для яго жыхароў.

**Галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП,** знаходзячыся на той жа пляцоўцы, расказаў пра тыя навінкі, якія пабачылі свет нядаўна:

— Сёлета адзначаецца 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Да гэтага юбілею мы выпусцілі дзве грунтоўныя кніжкі «Янка Купала. Для тых, хто любіць» і «Якуб Колас. Вобразы мілыя роднага краю...» Чым яны адрозніваюцца ад папярэдніх выданняў? У іх разам змешчаны ўспаміны і вершы паэтаў. Кнігі шчодра аздоблены ілюстрацыямі — гэта добрыя падарункавыя выданні. У гэтай, так бы мовіць, «небам званай» серыі летась выйшла кніга «Максім Багдановіч. Я не самотны...» Натуральна, сёлета мы прэзентуем і «скарынініяну». Гэта кнігі «Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка» — укладальнік Алесь Суша, — дзе разам сабраны розныя матэрыялы пра першадрукара, якія даўно нідзе не друкаваліся, — таксама «Францыск Скарына. Маем найбольшае самі» Алеся Разанава — кніга пераствораных паэтам прадмоў першадрукара і іншыя.

* * *

Свята ў Полацку адбылося. Яго эстафета ўрачыста перададзена наступнаму гораду — сталіцы Дня пісьменства — Іванаву Брэсцкай вобласці. Хочацца, каб новае свята таксама займела свае адметныя рысы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*г. Полацк.*

# ВІКТАРЫНА
## Мая Скарыніяна

### ПЫТАННІ ТРЭЦЯГА ТУРА

**Па вашых просьбах паўтараем пытанні заключнага тура віктарыны «Мая Скарыніяна», якую «Звязда» праводзіць сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай. Пераможцаў чакае прыз — адмысловая бясплатная экскурсія па галоўнай кніжнай скарбніцы краіны.**

**1.** *Адукацыйным цэнтрам якой рэспублікі быў горад Падуя, ва ўніверсітэце якога ў 1512 годзе Францыск Скарына атрымаў ступень доктара лекарскіх навук?*

- ❍ Фларэнцыя
- ❍ Венецыя
- ❍ Сіена
- ❍ Генуя

**2.** *Біблія Скарыны — пяты па ліку надрукаваны пераклад Святога Пісання. На якіх чатырох жывых мовах Біблія была выдадзена да скарынаўскай?*

- ❍ Нямецкай, італьянскай, чэшскай, галандскай
- ❍ Англійскай, нямецкай, італьянскай, чэшскай
- ❍ Французскай, галандскай, нямецкай, італьянскай
- ❍ Іспанскай, чэшскай, нямецкай, галандскай

**3.** *Якімі знакамі Скарына нумараваў старонкі сваіх выданняў?*

- ❍ Арабскімі лічбамі
- ❍ Літарамі кірылічнага алфавіта
- ❍ Літарамі лацінскага алфавіта
- ❍ Рымскімі лічбамі

**4.** *У якой з кніг Скарыны змешчана гэта гравюра?*



- ❍ У Чацвёртай Кнізе Царстваў
- ❍ У Кнізе Руфі
- ❍ У Кнізе Другога закона
- ❍ У Першай Кнізе Царстваў

**5.** *Адзіную з кніг Біблії Скарына выдаў двойчы. Якую?*

- ❍ Псалтыр
- ❍ Апостал
- ❍ Малую падарожную кніжку
- ❍ Эклезіяст

**6.** *У фільме «Я, Францыск Скарына» галоўную ролю — самога першадрукара — іграе Алег Янкоўскі. А каго ў тым жа фільме іграе яго старэйшы брат Расціслаў?*

- ❍ Карчмара
- ❍ Івана Скарыны
- ❍ Рэйхенберга
- ❍ Манаха-езуіта

**7.** *Хто аўтар кнігі пра Скарыну, якая пачынаецца з прысвячэння: «Усім маці кругу светлага паднябеснага, імёны якіх сёння людзям невядомыя, ды імёнамі сыноў якіх зямлі розных куткоў кругу паднябеснага славіцца не перастануць...»*

- ❍ Уладзімір Караткевіч
- ❍ Алесь Разанаў
- ❍ Алег Лойка
- ❍ Адам Глобус

**8.** *Чыё імя да нядаўняга часу насіў праспект Францыска Скарыны ў Полацку?*

- ❍ Уладзіміра Леніна
- ❍ Якава Свярдова
- ❍ Пятра Машэрава
- ❍ Карла Маркса

**9.** *Дзе ў Беларусі пастаянна экспануюцца арыгіналы Скарынавых выданняў?*

- ❍ У Нацыянальным гістарычным музеі
- ❍ У Нацыянальнай бібліятэцы
- ❍ У Полацку, у Музеі беларускага кнігадрукавання
- ❍ У Нацыянальным мастацкім музеі

**10.** *Пытанне ад Нацыянальнай бібліятэкі. Хто быў другім пасля Францыска Скарыны друкаром у Вялікім Княстве Літоўскім?*

***Адказы дасылайце да 15 верасня на паштовы адрас рэдакцыі: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск, з пазнакай «Скарыніяна», або на электронны адрас: skaryna@zviazda.by.***